ЗАКОНЫ ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ ІНТАРЭСАМ ГРАМАДСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння таксама неабходна вызначыць кола актуальных задач, якія будуць знаходзіцца ў цэнтры ўвагі членаў Савета Рэспублікі ў міжсесійны перыяд.

Адной з асноўных задач Савета Рэспублікі з'яўляецца ўдзел у распрацоўцы і прыняцці прававых рэгулятараў грамадскіх адносін у эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і духоўных сферах жыцця грамадства.

Гэтая сесія па сваім характары была насычаная і разнапланавая.

Савет Рэспублікі ўхваліў 51 законапраект, у тым ліку 37 аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў.

Прынята да ведама тры дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Зацверджаны найважнейшыя фінансавыя дакументы краіны — справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за 2019 год.

Навацыі ў заканадаўстве па пытаннях валютнага рэгулявання і валютнага кантролю закліканы садзейнічаць фарміраванню спрыяльнага інвестыцыйнага клімату і, як вынік, далейшаму ўмацаванню эканамічнага патэнцыялу нашай дзяржавы.

Прыняцце закона аб амністыі з'явілася чарговым этапам развіцця крымінальна-прававой палітыкі, заснаванай на гуманістычных пачатках і канстытуцыйных каштоўнасцях прававой дзяржавы.

На абарону правоў і свабод грамадзян і юрыдычных асоб накіраваны змены ў законы «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці», «Аб трацейскіх судах».

Для павышэння эфектыўнасці аказання медыцынскай дапамогі і спрашчэння працэдуры рэгістрацыі лекаў, у тым ліку для лячэння рэдкіх захворванняў, унесены папраўкі ў закон «Аб лекавых сродках».

Вялікая ўвага была ўдзелена і пашырэнню заканадаўчай базы двухбаковага супрацоўніцтва як з традыцыйнымі партнёрамі — Расіяй, Казахстанам, Узбекістанам, Таджыкістанам, Малдовай, Сербіяй, Іранам, Кубай, так і з патэнцыйнымі — Албаніяй, Сірыяй, Уругваем.

Ратыфікаваныя пагадненні з Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні выдачы віз, 10 міжнародных дагавораў «пяцёркі» ЕАЭС, 5 шматбаковых пагадненняў у рамках ААН, Савета Еўропы, Сусветнай паштовай арганізацыі, СНД.

Паважаныя калегі!

Як неаднаразова падкрэсліваў кіраўнік дзяржавы, законы павінны адпавядаць інтарэсам грамадства, улічваць рэальныя патрэбы нашых грамадзян, працаваць на вырашэнне канкрэтных задач на пэўным этапе развіцця нашай краіны.

Менавіта зыходзячы з гэтых пазіцый нам варта працягваць работу над заканадаўствам аб адміністрацыйнай адказнасці. У працэсе падрыхтоўкі праектаў Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях парламентарыямі было ўнесена ў міжведамасную экспертную групу больш за 500 заканадаўчых прапаноў. Значная частка з іх улічана. У міжсесійны перыяд нам трэба будзе завяршыць работу над гэтымі законапраектамі і на восеньскай сесіі разгледзець яе вынікі.

Яшчэ адзін важны дакумент, у падрыхтоўцы якога ўдзельнічаюць члены Савета Рэспублікі, — гэта Грамадзянскі кодэкс. Яго абноўленыя палажэнні павінны канцэптуальна перафармціраваць цэлы пласт грамадзянска-прававых адносін, спрыяць з'яўленню новых прававых паняццяў і катэгорый, забяспечыць эфектыўнае выкарыстанне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

У сваёй дзейнасці нам неабходна задзейнічаць патэнцыял навукова-кансультатыўнага савета, Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, Маладзёжнага парламента, шырэй выкарыстоўваць увесь комплекс кірункаў работы з насельніцтвам.

Жывыя зносіны з людзьмі, працоўнымі калектывамі, асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі — вось дзе выкрышталізоўваюцца пытанні, якія павінны знаходзіць адлюстраванне ў заканатворчай дзейнасці і легчы ў аснову плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2021 год.

Пэўныя напрацоўкі для гэтага ўжо маюцца. Толькі за першае паўгоддзе гэтага года членамі Савета Рэспублікі разгледжана амаль 2500 пісьмовых зваротаў. У рэгіёнах праведзена больш за 130 прамых тэлефонных ліній, звыш 300 асабістых прыёмаў, падчас якіх прынята 1100 чалавек.

Для рэалізацыі парламенцкіх паўнамоцтваў нам неабходна актыўна выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсы, сацыяльныя сеткі.

У Савеце Рэспублікі рэгулярна праводзіцца аналіз выступленняў сенатараў у СМІ і сеткавых рэсурсах.

Штодня ў сярэднім размяшчаецца 10—15 матэрыялаў па выніках парламенцкай дзейнасці.

Але, на мой погляд, гэта павінна быць сістэмная работа, якая забяспечыць нашу пастаянную і актыўную прысутнасць на гэтых камунікацыйных пляцоўках.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Наша пасяджэнне праходзіць у Дзень міжнароднага парламентарызму. Віншую вас з гэтым святам. Упэўнена, што мы і далей будзем рабіць важкі ўнёсак у развіццё міжпарламенцкага супрацоўніцтва, садзейнічаць вырашэнню актуальных праблем сучаснасці.

У сесійны перыяд мы ўпершыню ўзялі ўдзел у брыфінгах высокага ўзроўню, арганізаваных амерыканскімі парламентарыямі. Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праведзены шэраг сустрэч з кіраўніцтвам Еўрапейскага бюро і дэлегацыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, абмеркаваны эфектыўныя шляхі пераадолення пандэміі і спосабы мінімізацыі яе наступстваў.

Пазіцыя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь была прадстаўлена на пасяджэннях Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы і яе Пастаяннай камісіі па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве.

Праведзены нарады з кіраўнікамі рабочых груп — членамі Савета Рэспублікі, а таксама сустрэчы па пытаннях развіцця ўзаемадзеяння з парламентамі ЗША і Канады, Узбекістана, Фінляндыі, Славакіі.

У гэтым годзе мяркуецца пераход паўнамоцтваў сустаршыні ад Азербайджана да Беларусі ў Канферэнцыі мясцовых і рэгіянальных улад краін Усходняга партнёрства.

Мы павінны выкарыстаць гэту магчымасць для актывізацыі супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам у сферы мясцовага самакіравання.

Гэта дазволіць нам аб'ектыўна даваць інфармацыю аб нашай краіне, рабоце органаў улады, жыцці людзей, а таксама вывучаць замежны вопыт і найлепшыя практыкі ў самакіраванні.

Напярэдадні ў нас яшчэ адно важнае і адказнае мерапрыемства — VII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Плануецца, што ён пройдзе ў Мінску з 23 да 25 верасня. Яго тэма — «Гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі».

Адпаведная работа па падрыхтоўцы Форуму ажыццяўляецца ў цесным узаемадзеянні з Саветам Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі.

Неабходна, каб гэтае важнае мерапрыемства прайшло на высокім арганізацыйным узроўні і спрыяла далейшаму развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж нашай краінай і Расійскай Федэрацыяй.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Беларусь стаіць на парозе галоўнай палітычнай падзеі — выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Электаральная кампанія праходзіць у дастаткова няпростых умовах.

Кажучы пра цяперашні момант, наш Прэзідэнт вельмі дакладна адзначыў: разам сышліся некалькі «пандэмій» — у ахове здароўя, эканоміцы, палітыцы, інфармацыйнай прасторы.

Таму наша задача — данесці да людзей праўдзівую сутнасць таго, што адбываецца, не даць расхістаць дзяржаўныя асновы, абараніць краіну, яе суверэнітэт і незалежнасць. Хто, як не мы, павінны быць праваднікам дзяржаўнай палітыкі. І нам ёсць што сказаць людзям. За гады незалежнасці Беларусь адбылася як сацыяльна арыентаваная дзяржава, у якой забяспечваюцца стабільнасць і бяспека. Умацоўваюцца нашы пазіцыі на міжнароднай арэне. Сёння як ніколі важна захаваць і прымножыць дасягнутае для будучых пакаленняў, забяспечыць мірнае, годнае і спакойнае жыццё.

Я ўпэўнена, што члены Савета Рэспублікі ў поўнай меры апраўдаюць той высокі давер, які аказаны нам кіраўніком дзяржавы і народам.

Паважаныя калегі!

Дзякую вам за работу і віншую з надыходзячым святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Няхай у вашых дамах заўсёды пануюць мір і згода.

ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ВЫКЛІКІ ЧАСУ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усё гэта абумовіла напружаны характар парадку дня і складанасць тых задач, якія давялося вырашаць дэпутацкаму корпусу падчас сесіі.

У гэты адказны для краіны перыяд намі прыняты важныя палітычныя рашэнні аб прызначэнні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і дачы згоды кіраўніку дзяржавы на прызначэнне прэм'ер-міністра.

Заканадаўчым вынікам сесіі стаў разгляд каля 80 дакументаў, значная частка якіх накіравана на разняволенне дзелавой ініцыятывы, паляпшэнне ўмоў гаспадарання ў краіне і прасоўванне эканамічных інтарэсаў Беларусі за мяжой.

Мы працягнулі курс на лібералізацыю асобных сфер заканадаўства. У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы дэпутацкі корпус узяў самы непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы новых рэдакцый Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. У пастаянных камісіях было прааналізавана каля 800 прапаноў, якія паступілі ад выбаршчыкаў.

Прыняты закон «Аб амністыі ў сувязі з 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гадоў», які даў шанц многім асуджаным, у тым ліку і па 328-м артыкуле Крымінальнага кодэкса, вярнуцца да нармальнага жыцця ў грамадстве.

У ходзе сесіі ратыфікавана 37 міжнародных дагавораў, рэалізацыя якіх будзе спрыяць узмацненню гандлёва-эканамічных пазіцый Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, развіццю ўзаемавыгадных адносін з Іранам, Кубай, Сінгапурам, Сербіяй, Узбекістанам, Таджыкістанам і шэрагам іншых краін.

Важным крокам ва ўмацаванні сувязяў з нашымі заходнімі партнёрамі стала ратыфікацыя пагаднення з Еўрасаюзам аб спрашчэнні выдачы віз, якое ўступае ў сілу ўжо з заўтрашняга дня.

Гаворачы аб нашай міжпарламенцкай дзейнасці, варта адзначыць, што, нягледзячы на абмежаванні, уведзеныя ва ўсім свеце ў сувязі з пандэміяй, яна захавала сваю пазітыўную дынаміку.

Беларускія дэпутаты рэгулярна бралі ўдзел у вэбінарах па лініі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, сустрэчах з парламентарыямі і кіраўнікамі дыпламатычных місій Германіі, Італіі, Расіі, ЗША, Японіі, а таксама з прадстаўнікамі шэрагу міжнародных арганізацый.

Упершыню ў рэжыме анлайн прайшлі пасяджэнні пастаянных камісій і Савета Парламенцкай Асамблеі АДКБ. Яго ўдзельнікі абмеркавалі стратэгію сістэмнага ўзаемадзеяння па забеспячэнні бяспекі ў рэгіёне і пацвердзілі сваю рашучасць супрацьстаяць спробам фальсіфікацыі гісторыі і перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны.

Сур'ёзная работа праведзена па падрыхтоўцы да пяцьдзясят восьмай сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, якая адбудзецца ўжо на наступным тыдні. Асноўнымі прыярытэтамі для дэпутацкага корпуса тут застаюцца роўнасць правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, адстойванне нацыянальных інтарэсаў у рамках Саюзнага будаўніцтва. Інтэграцыя павінна насіць узаемавыгадны характар, спрыяць эфектыўнаму развіццю эканомік нашых дзяржаў.

Толькі ўстойлівая, адаптыўная і дакладна кіраваная эканоміка служыць залогам сацыяльнага дабрабыту. Таму пытанні эканамічнага росту павінны заставацца ў цэнтры ўвагі дэпутатаў і ў міжсесійны перыяд.

Сёння прынцыпова важна аднавіць нармальны рытм работы эканомікі і падрыхтаваць пакет бюджэтных дакументаў на 2021 год. Дэпутаты ўжо падключыліся да гэтага працэсу, актыўна ўзаемадзейнічаючы з урадам, профільнымі міністэрствамі і ведамствамі.

Наша задача — прааналізаваць сітуацыю, звязаную з пандэміяй, і прадумаць, як выкарыстоўваць патэнцыйныя магчымасці, якія яна ў сабе змяшчае, на карысць краіны.

Пры гэтым нельга забываць аб вызначэнні шляхоў далейшага развіцця. Неабходна прыстасаваць нацыянальную эканоміку да новай рэальнасці, робячы акцэнт на лічбавізацыі, тэхналагічных інавацыях, змене бізнес-стратэгій і менеджменту.

Зразумела, гэтыя ідэі знойдуць сваё адлюстраванне ў новай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, у распрацоўцы якой возьме ўдзел і дэпутацкі корпус.

Пад жорсткі кантроль трэба ўзяць работу з законапраектамі эканамічнага блока. Гэта перш за ўсё змяненні ў законы аб гаспадарчых таварыствах, гандлі і грамадскім харчаванні, аб выканаўчым вядзенні. Неабходна паскорыць іх падрыхтоўку да другога чытання і забяспечыць своечасовы разгляд.

Акрамя таго, варта актыўна падключыцца да работы профільных міністэрстваў над новай рэдакцыяй Закона аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве). Мы павінны забяспечыць яго якасную падрыхтоўку яшчэ да ўнясення ў Палату прадстаўнікоў.

З улікам правапрымяняльнай практыкі, шматлікіх зваротаў грамадзян неабходна падысці і да карэкціроўкі зямельнага заканадаўства. Пытанне няпростае і патрабуе захавання балансу інтарэсаў дзяржавы і грамадзян.

Асобая задача ў міжсесійны перыяд — выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы аб уступленні ў сілу новых рэдакцый Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях са студзеня 2021 года. Прынятыя намі сёння ў першым чытанні адпаведныя праекты трэба дэталёва прапрацаваць, дасканала абмеркаваць з практыкамі, каб да пачатку восеньскай сесіі максімальна ліквідаваць наяўныя супярэчнасці.

Цэлы комплекс законапраектаў звязаны з рэалізацыяй канстытуцыйных правоў і гарантый нашых грамадзян. На парадку дня — павышэнне даступнасці правасуддзя, якасць аказання медыцынскай дапамогі, актыўная сацыялізацыя інвалідаў, пенсійнае забеспячэнне, жыллёвыя пытанні.

Яшчэ адзін важны кірунак, дзе дэпутацкаму корпусу трэба сумесна папрацаваць з урадам, — унясенне змяненняў у Кодэкс аб адукацыі. Падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў, усебаковае развіццё чалавечага капіталу — гэта неадкладнае патрабаванне часу.

Словам, работа наперадзе вельмі адказная, бо нормы ўсіх гэтых законапраектаў закранаюць інтарэсы практычна кожнага грамадзяніна, запатрабаваныя бізнес-супольнасцю і правапрымяняльнікамі.

Натуральна, у цяперашні час асноўная ўвага грамадскасці прыцягнута да галоўнай палітычнай кампаніі — выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Любыя выбары суправаджаюцца павышанай сацыяльнай актыўнасцю і палітызацыяй грамадскага жыцця. На жаль, у Беларусі пэўныя сілы кожны раз спрабуюць выкарыстаць выбарчую кампанію не на карысць краіны, а каб разгайдаць сацыяльна-палітычную сітуацыю.

Цяперашнія выбары не выключэнне. Мы бачым спробы, якія падтрымліваюцца звонку, пасеяць раскол у грамадстве, унушыць народу недавер да ўлады, спекулюючы на тэме пандэміі і звязаных з ёй эканамічных цяжкасцях.

Пад выглядам перадвыбарных мерапрыемстваў наладжваюцца адкрытыя правакацыі, выкарыстоўваюцца брудныя паліттэхналогіі, ідзе масіраваная інфармацыйная атака на кіраўніцтва краіны, прыхільнікаў дзеючай улады. Гэта недапушчальна.

Задача парламентарыяў — прыкласці максімум намаганняў, каб выбары прайшлі сумленна, адкрыта, у спакойнай, бяспечнай абстаноўцы і ў строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам.

Трэба больш актыўна працаваць з грамадзянскай супольнасцю, выслухоўваць усе думкі і цярпліва, без эмоцый тлумачыць, што стаіць за безадказнымі папулісцкімі заявамі і што на самай справе трэба рабіць, каб забяспечыць суверэнітэт краіны, сацыяльную стабільнасць і здароўе грамадзян.

Незалежнасць і дабрабыт дорага каштуюць. Яны дасягаюцца ўпартай працай, выверанай знешняй палітыкай, адзінствам нацыі. Галоўная задача сёння — захаваць тое, што створана ў краіне за чвэрць стагоддзя, забяспечыўшы мір, справядлівасць і эвалюцыйны шлях развіцця, і на гэтым трывалым падмурку рухацца наперад.

Адначасова дэпутатам неабходна працягнуць маніторынг сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэгіёнах. У цэнтры ўвагі павінны быць фінансавае становішча прадпрыемстваў, захаванне рабочых месцаў і працоўных калектываў, своечасовасць выплаты заробкаў, пенсій, дапамог. Асаблівага клопату патрабуюць найбольш уразлівыя катэгорыі насельніцтва — пажылыя людзі, інваліды, шматдзетныя сем'і і, зразумела, урачы, якія працягваюць заставацца на пярэднім краі барацьбы з вірусам.

Мы павінны падтрымаць людзей і словам, і справай. Упэўнены, што ў беларускага народа хопіць мудрасці годна прайсці гэтую палітычную кампанію і захаваць Беларусь як дзяржаву, якая ўпэўнена рэалізуе ўласны шлях развіцця.